17. Рыхлик Е. Жизнь славян. Популярные очерки. – К., 1915. – Вып. 1. Мать слава и ее австрийские дети; Вып. 2. Поэзия славянского горя и славянских надежд (Коллар и Сладкович).
18. Рыхлик Е. Жизнь славян… – Вып. 1. – С.3.
19. Рыхлик Е. Жизнь славян… – Вып. 1. – С.7 – 8.
20. Там само. – С.14.
21. Там само. – С.5.
22. Рихлік Є. Слов'янофільство Кирило-Методіївців. (З ідеології Кирило-Методіївського братства) // Записки Ніжинського інституту народної освіти. – 1926. – Кн. VI. – С.204.
23. Рыхлик Е. Жизнь славян… – Вып. 1. – С.6 – 26.
24. Там само. – С.8 – 9.
25. Там само. – С.34 – 40.
26. Там само. – С.34.
27. Там само. – С.40.
28. Там само. – С.27 – 28.
29. Там само. – С.28 – 29.
30. Рихлік Є. Слов'янофільство Кирило-Методіївців… – С.195.
31. Рыхлик Е. Жизнь славян… – Вып. 1. – С.17.
32. Там само. – С.21 – 23.
33. Там само. – С.25.
34. Там само. – С.20 – 30.
35. Там само. – С.19.
36. Рихлік Є. Слов'янофільство Кирило-Методіївців… – С.198.
37. Там само. – С.198.
38. Рыхлик Е. Поэтическая деятельность… – С.129.
39. Цимбаев Н. Славянофилы и западники // Страницы минувшего. Сборник: Очерки. – М., 1991. – С.323 – 373.
40. Рыхлик Е. Жизнь славян… – Вып. 1. – С.37.
41. Там само. – С.38.
42. Рихлік Є. Слов'янофільство Кирило-Методіївців… – С.208.
43. Там само. – С.211.
44. Рыхлик Е. Поэтическая деятельность… – С.125 – 127.
45. Рыхлик Е. Жизнь славян… – Вып. 1. – С.37.
46. Рихлік Є. Слов'янофільство Кирило-Методіївців… – С.211 – 213.
47. Рыхлик Е. Жизнь славян… – Вып. 1. – С.3.

***Lyudmyla Pavlenko***

**THE IDEA "SLAVIC WORLD" AND THE SLAVIC UNITY IN THE SCIENTIFIC HERITAGE OF E.RYKHLIK**

*The article analyzes the conditions of forming and specific of interpretation of the idea "Slavic world" and the Slavic unity in the scientific heritage of E.Rykhlik. Special attention is made to the scientific's Slavic views as a pupil of St.Vladimir Kyiv University.*

*Key words: E.Rykhlik, Slavic studies, Slavic unity.*

Надійшла до редакції 19.02.2008 р.

УДК 947. 6 : 323.1 (470) (= 161.3 = 162.1 = 112.28) "19"

***Валянцін Міхедзька***

## "ПАЛЯК, ЯЎРЭЙ І РУСКІ": СЯБРЫ І ВОРАГІ "РУССКОГО ДЕЛА" Ў ПАЧАТКУ XX ст. ВАЧЫМА РАСІЙСКАЙ АДМІНІСТРАЦЫІ "ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯГА КРАЮ"

*В статье рассмотрены взгляды российской администрации белорусских губерний "Северо-Западного края" на национальные и этноконфессиональные группы населения в русле осуществления русификационной политики.*

*Ключевые слова: Северо-Западный край, Российская империя, национальная политика, поляки, евреи, русские, белорусы, администрация*

У спадчыну ад Рэчы Паспалітай Расійская імперыя атрымала вялізарныя тэрыторыі "заходніх ускраін" – беларускія, украінскія і літоўскія землі. Беларуска-літоўскія землі былога Вялікага княства

Літоўскага стварылі так званы "Паўночна-Заходні край" імперыі. Паліканфесійнае і паліэтнічнае насельніцтва тут істотна адрознівалася сваёй сацыяльнай, эканамічнай і культурнай інфраструктурай, трыдыцыямі грамадскага жыцця і дзеяння. Імперская ўлада на працягу XIX ст. з мэтай "абрусення" гэтых тэрыторый паступова руйнавала мясцовыя традыцыі. Найбольшую заклапочанасць улады выклікала тут польская культурная і эканамічная перавага. З часоў Аляксандра III ў палітычных мерапрыемствах урада выразна прасочвалася памкненне да культурна-цывілізацыйнай уніфікацыі краю ў рэчышчы расійска-праваслаўнай культуры. Таварыш міністра унутраных справаў і дзяржаўны сакратар Расійскай імперыі С. Я. Крыжаноўскі ў пачатку XX ст. заўважаў: "З пункту гледжання інтарэсаў рускага народу як нацыі і Расійскай імперыі як адзінага арганізма… найбольш карысным і лепшым было б паступовае абарачэнне ўсіх падданых Расіі ў нацыянальна рускіх, з магчымым прыціскам іншых нацыянальных пачаткаў…як у Заходнім краі, дзе прыходзілася імкнуцца да вызваленння рускай нацыянальнай глебы ад наносаў польскай цывілізацыі…"[1].

Ці валодала Расія культурным асіміляцыйным патэнцыялам, неабходным для абрусення краю? Крыжаноўскі прызнаваў, што адміністрацыйныя і культурныя магчымасці Расіі для ажыццяўлення такой палітыкі на "заходніх ускраінах" нават у пачатку XX ст. былі яшчэ недастатковыя. У выніку, "высілкі, што былі накіраваныя на абрусенне ... абмяжоўваліся пераважна захадамі гвалтоўнага ўздзеяння...і толькі раздражнялі мясцовае насельніцтва" [2]. Але гэтыя прызнанні былі зроблены ўжо рэтраспектыўна. У 1904 г. віленскі генерал-губернатар П.Дз. Святаполк-Мірскі ў пададзенай цару справаздачы адказваў на гэтае пытанне сцвярджальна: " У першыя дзве траціны XIX стагоддзя нам уяўлялася цяжкім выставіць у адносінах да заходніх ускраін што небудзь акрамя матэрыяльнай сілы...Другая палова мінулага стагоддзя была часам гіганцкага росту духоўных сіл Расіі. Рост гэты адзначаецца у літаратуры, мастацтве, навуцы, дзяржаўных наканаваннях, якія адлюстроўваюць сваеасаблівыя творчыя пачаткі рускага народа. Некультурная некалі Расія выступае цяпер у дачыненні да сваех больш цывілізаваных іншародцаў узброенай магутнымі сіламі...наш Урад...ужо не сустракае сярод заходніх іншародцаў таго супраціву з боку іх духоўных пачаткаў, які б у мінулы час мог уяўляцца небяспечным"[3].

Тым не менш, агульны рэпрэсіўна-абмежавальны характар расійскіх палітычных мерапрыемстваў і недастатковасць тут расійскага культурна-асіміляцыйнага патэнцыяла, таксама як і практычная неабходнасць супрацоўніцтва з мясцовымі элітамі, добра ўсведамляліся ўрадавымі вярхамі. Асабліва яскрава гэта выявілася ў канцы XIX – пачатку XX ст., калі расійская дзяржаўная машына сутыкнулася ў тут з найбольш вострымі з часоў паўстання 1863-1864 гг. выклікамі. Мэты расійскай палітыкі - "канчатковае зліццё з астатняй Расіяй", ці то ажыццяўленне "русского дела" - русіфікацыйнай палітыкі ў цэлым спектры накірункаў – ад адміністрацыйна-кадравага да культурна-моўнага, не падлягалі перагляду. У параўнанні з 60-70-гг. XIX ст., аднак, адбыліся істотныя перамены ў этнапалітычным становішчы. Канчаткова сфармавалася сістэма "абмежавальнага" заканадаўства, якая садзейнічала стварэнню вычварнай сацыяльна-эканамічнай стратыфікацыі мясцовага грамадства. Разам з тым пашыраўся вызвольны рух супраць імперскай улады, што у першыя гады XX ст. зноў актуалізавала для яе праблему захавання расійскага панавання ў краі. Сярод вышэйшай сталічнай бюракратыі, а таксама і на мясцовым, губернскім узроўні выявіліся адрозненні ў бачанні галоўных праблем, якія паўставалі перад расійскай уладай у "Паўночна-Заходнім краі", у разуменні неабходных і дапушчальных сродкаў іх вырашэння і, ўвогуле, кіравання. Да таго ж, у Беларусі ажыццяўленне ўрадавага курса накладвалася на мураўёўскія традыцыі кіравання краем. Як адзначае расійская даследчыца Г. Камзолава, "сістэма Мураўёва", якая паказала сваю эфектыўнасць у 1863 – 1864 гг., працягвала дзейнічаць яшчэ не адно дзесяцігоддзе, і пытанне аб суцэльнай адмове ад яе ніколі не ставілася"[4]. Збольшага, на пачатку XX ст. захоўвалася і замацаванае М.Мураўёвым атаясамленне канфесійнай прыналежнасці з этнічнасцю, хаця разам с тым ўсё часцей чуліся крытычныя водгукі на гэта нават якраз з боку прадстаўнікоў расійскай адміністрацыі.

© Міхедзька В.А., 2008

Адміністрацыя мусіла вызначыцца ў сваім стаўленні да нацыянальных супольнасцяў рэгіёну – акрэсліць сярод іх небяспечныя для "русского дела", знайсці магчымых памочнікаў і саюзнікаў. Якраз гэтая праблема займае ў першыя гады XX ст. ў разважаннях мясцовай губернскай адміністрацыі прыкметнае месца. Бадай, найбольш закончаны і, адначасова, палемічны, характар гэтыя разважанні набылі ў справаздачы віленскага генерал-губернатара П.Дз. Святаполка-Мірскага, якая была прадстаўлена цару ў маі 1904 г. Разглядаючы асноўныя нацыянальныя і рэлігійныя супольнасці края, віленскі генерал-губернатар заўважаў, што расійскі ўрад з 60-х гадоў XIX ст. усе свае сілы пакладаў на змаганне супраць польскага палітычнага руху. Між тым, пераконваў Святаполк-Мірскі, на пачатку XX ст. у "Паўночна-Заходнім краі" польская супольнасць, пры яе унутранай сацыяльнай неаднастайнасці, тым не менш ўжо не уяўляла значнай небяспекі расійскаму панаванню: "польскае грамадства страціла ўжо ў вельмі значнай ступені сваю сілу...Працэс канчатковага абрусення ("обрусения") Паўночна-Заходняга краю ідзе хаця і марудна, але цвёрдымі крокамі..." Адзначыўшы, што польскае гарадское насельніцтва "больш ліберальнае і таму больш накіраванае супраць урадавай

палітыкі", генерал-губернатар звяртаў увагу Мікалая II на мясцовых польскіх памешчыкаў як на кансерватыўную супольнасць : "таму вышэйпаказаная група больш спакойная, больш цвярозая, уяўляецца і большай апорай для ўраду"[5]. Святаполк-Мірскі быў упэўнены, што пры захаванні "разумнасці" і паслядоўнасці у ажыццяўленні абмежавальнага заканадаўства памешчыцкі "разумны польскі элемент здольны прызнаць лагічнасць русіфікацыйнай палітыкі ў Паўночна-Заходнім краі" [6]. У той жа час, генерал-губернатар прапаноўваў ураду зняць заканадаўчыя перашкоды і стварыць спрыяльныя ўмовы для перасялення з краю на усход імперыіі малазямельнай шляхты, якая, у адрозненне ад буйных землеўладальнікаў, уяўлялася элементам недабранадзейным. Генерал-губернатар пераконваў урад у неабходнасці абаперціся на лаяльныя элементы польскага грамадства краю, спрыяць іх уцягванню у вырашэнне мясцовых культурных і гаспадарчых задач. У праціўным выпадку, лічыў ён, "далейшае захаванне польскай грамадскасці без усялякіх сувязяў з рускай спрыяе згуртаванасці асобаў польскага паходжання, нараджае ў польскім грамадстве незадавальнне і апазіцыйныя настроі. Усё гэта некарысна ўплывае на сам ход рускай справы ў краі" [7].

Падобныя погляды, хаця і больш асцярожна, на мяжы стагоддзяў выказвалі таксама губернатары беларускіх губерняў.

Мінскі губернатар А. Мусін-Пушкін у 1903 г. ставіўся да поспехаў русіфікацыі больш скептычна: "хаця рускае землеўладанне павялічваецца, але сапраўднае аюрусенне ідзе параўнальна марудна" з тае прычыны, што рускія землеўладальнікі у краі не асядаюць, а здаюць свае землі у арэнду мясцовай шляхце. У той жа час, адзначыўшы ролю абмежавальнага заканадаўства у адасабленні польскага і рускага грамадства губерні, мінскі губернатар даводзіў ураду "безумоўную лаяльнасць і вернасць усяго вышэйшага польскага насельніцтва". На думку губернатара, погляды мясцовага дваранства за мінулыя дзесяцігоддзі істотна перамяніліся – "зніклі нязбыўныя мроі, з'явілася шчырае падпарадкаванне дзяржаўнай уладзе". Асаблівыя надзеі мінскій губернатар, як і віленскій генерал-губернатар, ускладаў на маладое пакаленне польскага буйнога дваранства, якое ўжо было выхавана ў расійскай школе. Яно уяўлялася яму "вельмі значным і сур'ёзным кансерватыўным элементам у краі". Губернатар падкрэсліваў ролю польскага буйнога дваранства як сувязі паміж польскім насельніцтвам і расійскай уладай[8].

Віленскі губернатар К.К. Пален у справаздачы за 1903 г. таксама выказваў меркаванне, што польская грамада, асабліва моладзь, якая набыла адукацыю у Пецярбургу і Маскве, не толькі не уяўляе небяспекі кансерватыўным дзяржаўным асновам, але і сама можа стацца апірышчам ураду ў краі[9].

Адначасова, у дачыненні да уплывовай польскай грамады у асяроддзі мясцовай вышэйшай адміністрацыі захоўвалася агульная насцярожанасць. Разумеючы абмежаванасць адміністрацыйнай русіфікацыі, улады прыглядаліся да мясцовага "рускага" насельніцтва. На пачатку XX ст. мясцовыя улады вылучалі у ім некалькі асяродкаў, у тым ліку такія адрозныя па свайму сацыяльнаму, культурнаму і прававому статусу супольнасці рускіх стараввераў і беларускага сялянства. Пры гэтым нават беларускія сяляне-каталікі усё часцей адасабляліся ад польскага каталіцкага асяродка і разглядаліся не толькі як аб'ект, але і ў пэўнай перспектыве, суб'ект русіфікацыйных намаганняў. Даследаванні беларускага краю, якія вяліся у другой палове XIX ст. – пачатку XX ст. і збольшага былі інспіраваныя расійска-польскім супрацьстаяннем, прынеслі досыць нечаканыя вынікі. Назапашаны матэрыял грунтаваў наяўнасць асобнага беларускага этнасу і падштурхоўваў да фармулёўкі самастойнай беларускай ідэі. Аднак беларушчына расійскімі ўладамі і яе апанентамі з польскага боку разглядалася хутчэй як поле змагання і адначасова, як рэсурс гэтага змагання.

Віленскі-генерал-губернатар П.Дз.Святаполк-Мірскі, які сам аказваў фінансавую і арганізацыйную падтрымку навуковаму вывучэнню края, у тым ліку беларусазнаўчым даследаванням Я. Карскага, надаў у сваёй справаздачы асобную ўвагу беларускаму насельніцтву. Асобны падраздзел даклада, прысвечаны беларусам, змешчаны ў раздзеле "Веравызнанні" і названы "Беларускае племя". Фрагмент справаздачы, у якім гаворыцца аб беларусах, большы па памерах суседняга падраздзелу аб рускіх стараверах, але значна саступае вялікім асобным раздзелам аб польскім, літоўскім і яўрэйскім насельніцтве края. Відавочна, што такое размеркаванне невыпадковае і адлюстроўвае тую дапаможную ролю, якую адводзілі беларускаму люду расійскія улады. Святаполк-Мірскі звяртаў увагу на тое, што "беларускае насельніцтва", перад усім, сялянскае, нягледзячы на канфесійны падзел на праваслаўных і каталікаў, аб'яднанае агульнасцю мовы. Будучыню беларусаў генерал-губернатар бачыў у далучэнні альбо да польскага, альбо да рускага народаў[10]. Перспектыва зліцця праваслаўнай часткі беларусаў з рускімі не выклікала ў Святаполка-Мірскага сумненняў. Гістарычныя лёсы беларусаў-католікаў мусілі залежаць ад урадавай палітыкі, перад усім у дачыненні да каталіцкай царквы: "у патрэбах дасягнення ўрадавых у краі задач, больш правільна падыйсці да беларускага племені с боку агульнасці яго паходжання з астатнім рускім народам, а не з боку рэлігіі ... калі ж беларускае племя ўбярэ ў сябе ўсведамленне, што яно ёсць племя рускае, яно само звернецца да праваслаўнай царквы ... я надаю найбольш важкую у справе кіравання ... краем значнасць пытанню аб развіцці сярод беларускага насельніцтва нацыянальнай самасвядомасці і увядзення у беларускія каталіцкія прыходы дадатковага

набажэнства на іх роднай мове замест цяперашняй польскай". Віленскі генерал-губернатар у падтрымку сваёй думкі звяртаў увагу урада – "сярод католікаў беларусаў ўжо пачынае праяўляцца плынь на карысць адасаблення ад палякаў, плынь, якая, відавочна, патрабуе падтрымкі з боку урада"[11].

Як заўважыў расійскі даследчык А.Мілер, "урад і мясцовыя дзеячы нярэдка гатовыя былі аказаць падтрымку фармаванню асаблівай нацыянальнай ідэнтычнасці … народаў дзеля таго, каб заблакаваць рэалізацыю больш магутных канкурэнтных праектаў асіміляцыі і культурнай кансалідацыі"[12]. Вядома, што яшчэ М.М. Мураўёў шырока выкарыстоўваў беларускае праваслаўнае сялянства для падаўлення антырасійскага паўстання 1863/64 гг., аднак ніколі не выкарыстоўваў яго ідэнтыфікацыю як беларусаў. Расійскі даследчык М. Далбілаў у гэтым слушна бачыць свядомае і мэтанакіраванае замоўчванне рэчаіснасці дзеля захавання імперскай ідэалагемы "адзінага рускага народа"[13]. У гэтым сэнсе прапановы П.Дз. Святаполка-Мірскага адносна каталіцкай беларускай грамады выяўляюць пэўны зрух бюракратычнай (а, магчыма, разам з ёй і расійскай грамадскай) свядомасці ў дачыненні да беларусаў.

Віленскі губернатар К. Пален, у сваю чаргу, азначыў беларусаў як доўгі час прыгнечаную і "самую лёгкую у кіраванні народнасць губерні". У той жа час ён заўважаў у іх не толькі "падатлівасць, паслухмянасць", але і такія рысы як "хітрасць і помслівасць" [14]. Магілёўскі губернатар Н. Клінгенберг запэўніваў урад у лаяльнасці праваслаўнай большасці беларускага сялянства [15].

Насамрэч рэальныя магчымасці выкарыстання імперыяй беларускага насельніцтва як супрацьвагі польскаму культурнаму і эканамічнаму ўплыву былі вельмі абмежаваныя. Фармальна праваслаўная частка беларусаў лічылася "рускімі", што, як сцвярджае А.Капэлер, адкрывала для іх магчымасці кар'ернага росту пры ўмове валодання рускай мовай [16]. На справе скарыстаць з гэтай "прывілегіі" было вельмі цяжка дзеля захавання сацыяльных перапонаў і канкурэнцыі з боку больш надзейных у вачох адміністрацыі ўраджэнцаў унутраных расійскіх губерняў; беларусы жа каталіцкага веравызнання і на пачатку ХХ ст. цярпелі дыскрымінацыю як сацыяльна-эканамічнай, гэтак і ў веравызнаўчай сферы. У рэчаіснасці магчымасці кар'ернага росту былі абумоўлены паспяховасцю пазбаўлення ад спецыфічных рысаў беларускай моўна-культурнай ідэнтычнасці. Зразумела, што для большасці выхадцаў з сялянскага асяроддзя плата не уяўлялася надта вялікай, бо мова разглядалася тут не як самадастатковая каштоўнасць, а выключна як інструмент камунікацыі. Інструмент, які быў няздольны забяспечыць у Расійскай імперыі сацыяльны рост. У гэтым сэнсе трэба пагадзіцца з А.І. Мілерам, які казаў пра "самарусіфікацыю" заходніх "ускраін". Але вынікі яе пры захаванні асноўнага масіву патрыярхальнай беларускай вёскі былі нязначныя. Пры адсутнасці развітай і шырокай рускамоўнай адукацыйнай і інфармацыйнай прасторы для большасці прэтэндэнтаў-беларусаў з сялянскіх нізоў цалкам пазбавіцца спецыфічных адзнакаў было немагчыма. Зрэшты, заставаліся перашкодай і "плябейскі" статус беларускага сялянства і яго эканамічная нямоглпасць.

Нягледзячы на шматлікія рытарычныя і прагматычныя намаганні мясцовай адміністрацыі звярнуць увагу манарха на сваю заклапочанасць лёсамі "рускага насельніцтва" краю, насамрэч гэта не знаходзіла у ім асаблівага водгуку. Мікалай ІІ, як засведчыў у дзённікавых запісах 1903 г. генерал Курапаткін, "з нейкай гідлівасцю ставіўся да беларусаў ("Несколько брезгливо относится к белоруссам и вполне презрительно к евреям")[17] Як бачна, імператар у асяроддзі сваех набліжаных быў далёкі ад таго, каб лічыць беларусаў "таксама рускімі" і ставіў іх бліжэй да нялюбых яму яўрэяў. Як бы там ні было, трэба пагадзіцца з заўвагай Т. Ўікса: "абрусенне краю" мелася праводзіцца вакол беларусаў, але не пры актыўным удзеле іх саміх[18].

Другой часткай "рускай народнасці" беларуска-літоўскага краю былі рускія стараверы. Віленскі генерал-губернатар падкрэсліваў значнасць місіі старавераў па умацаванні у краі "рускіх культурных пачаткаў". Менавіта рускія стараверы, якія захавалі "у поўнай чысціні рускую мову і рускія звычаі" і у супрацьвагу беларусам "зусім не паддаліся ўплывам польскай народнасці і каталіцкай царквы" названы віленскім генерал-губернатарам сапраўдным апірышчам расійскага ўраду у краі [19].Аднак колькасць рускіх старавераў у Беларусі была невялікай, і асаблівасці іх сацыяльнага і гаспадарчага побыту, вызначаныя рэлігійнай традыцыяй, а таксама іх прававая непаўнавартасць, замацаваная дыскрымінацыйным "антыраскольніцкім" заканадаўствам, значна звужалі магчымасці іх "русіфікацыйнага" выкарыстання.

Актывізацыя пошукаў надзейнага апірышча ўлады ў краі ў першыя гады ХХ ст. была выклікана хуткім развіццём масавага вызваленчага руху. Віленскі генерал-губернатар Святаполк-Мірскі прызнаваў, што урадавая адміністрацыя краю, прыкладаючы ўсе свае сілы пасля паўстання 1863/64 гг. на змаганне з польскім рухам, не пагардліва не звяртала належнай увагі на развіццё яўрэйскага насельніцтва. Між тым, у гэтым асяроддзі пашырыўся рэвалюцыйны рух, якіх па маштабах і формах праяўлення далёка перакрыў апазіцыйныя памкненні палякаў Паўночна-Заходняга края: "на першым плане цяпер пытанне рабочае, якое шчыльна сплецена з пытаннем яўрэйскім"[20].. Якраз у аналізе гаротнага становішча яўрэйскага насельніцтва края Святаполк-Мірскі выказаў найбольш рэзкую крытыку урадавай палітыкі у "яўрэйскім пытанні". Прапанаваўшы неадкладную адмену найбольш адыёзных абмежаванняў, генерал-

губернатар падсумоўваў: "назіранні мае за час кіравання краем пераканалі мяне, што якім бы моцным не было хваляванне у асяроддзі яўрэйскага насельніцтва, у ім ...шмат тых станоўчых элементаў, захаваць давер якіх для ўрадавай улады неабходна"[21]. У данясеннях губернатараў беларускіх губерняў гэтага часу заклапочанасць віленскага генерал-губернатара падзялялася. Віленскі губернатар К.К. Пален таксама лічыў найбольш небяспечным для дзяржаўнай улады "яўрэйскі сацыяльны рэвалюцыйны рух " [22]. М.М. Клінгенберг пераконваў цара, што галоўнай прычынай ускладнення грамадска-палітычнага становішча у краі з'яўлялася "крайняя варожасць яўрэйскага насельніцтва да рускага". Магілеўскі губернатар лічыў, што магчымасцяў абаперціся на "станоўчыя элементы яўрэйскай грамады" ужо няма: "яшчэ 10 гадоў таму больш адукаваныя і культурныя яўрэі імкнуліся да зближэння з рускім грамадствам…Зараз яны прасякнуты духам сепаратызма…" Дзеля гэтага, рабіў выснову насуперак прапановам Святаполка-Мірскага магілеўскі губернатар, абмежаванне антыяўрэйскага заканадаўства немагчымае. [23].

Такім чынам, да пачатку XX ст. расійская ўлада стварыла настолькі складаную і супярэчлівую сістэму саслоўных і этнаканфесійных абмежаванняў і дазваленняў, што аніводная з буйных супольнасцяў краю не магла разглядацца ёй сапраўдным саюзнікам і апірышчам. Дасягненне "канчатковага зліцця краю з астатняй Расіяй" сутыкалася з непарадольнымі саслоўнымі і сацыяльнымі перашкодамі.

*Аўтар выказвае шчырую ўдзячнасць к.г.н. В.П. Пічукову за прадстаўленую магчымасць карыстацца каштоўнымі крыніцавымі матэрыяламі.*

***Літаратура і крыніцы***

1. Крыжановский С.Е. Заметки русского консерватора // Вопросы истории. - 1997.-№4. – С.122.
2. Тамсама
3. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей – РДГА). Ф.1284. Воп.194. Спр.136. арк.73 адв.-74
4. Комзолова А.А. Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ. – М.,2005.- с. 337.
5. РДГА. Ф.1284. Воп.194. Спр.136. арк.60, 63 адв., 100
6. Тамсама, арк. 7адв.
7. Тамсама, арк. 64.
8. РДГА. Ф.1284. Воп.194. Спр.98. арк. 5 адв. – 7.
9. РДГА. Ф.1284. Воп.194. Спр 52. арк.3адв
10. РДГА). Ф.1284. Воп.194. Спр.136. арк.26.
11. Тамсама, арк.30.
12. Миллер А.И. Русификации: классифицировать и понять / [Электронны рэсурс].–Рэжым доступа:http://www.saratov.iriss.ru/empires/docs/millernew.doc. - Дата доступа 2.03.2006.
13. Долбилов М.Д. Культурная идиома возрождения России как фактор имперской политики в Северо-Западном крае в 1863-1865 гг.// [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.saratov.iriss.ru/empires/docs/dolbilov-abimperio.doc. - Дата доступа 2.03.2006.
14. РДГА. Ф.1284. Воп.194. Спр 52. арк.3.
15. РДГА. Ф.1284. Воп.194. Спр. 121. арк.3.
16. Каппелер А. Мазепинцы, малороссы, хохлы: украинцы в этнической иерархии российской империи //Россия-Украина: история взаимоотношений. – М.,1997. С.125-144.
17. Дневник А.Н. Куропаткина// Красный архив.- 1922.- Т.2. - с.73.
18. Теодор Р. Викс "Мы" или "они"? Белорусы и официальная Россия, 1863–1914// Российская империя в зарубежной историографии. Работы последних лет: Антология.-М., 2005. с. 589–609.
19. РДГА). Ф.1284. Воп.194. Спр.136. арк.42адв.-43
20. Тамсама, .арк.100-100адв.
21. Тамсама, арк.104.
22. РДГА. Ф.1284. Воп.194. Спр 52. арк.4адв.
23. РДГА. Ф.1284. Воп.194. Спр 92. арк.5-5адв.

***Valentin Mihedska***

## "POLE, JEW AND RUSSIAN": SUPPORTERS AND ENEMIES OF "RUSSKOE DELO" AT THE BEGINNING OF XXTH CENTURY THROUGH THE EYES OF RUSSIAN ADMINISTRATION OF "NORTH-EAST REGION".

*The publication analyses the evolution of national policy of the Russian administration in Belarus in the beginning of 20 century.*

*Key words: the Russian empire, Russification, North-Western Provincesr, Nationality Policy, the Poles, the Russians, the Belarusians.*

Надійшла до редакції 15.03.2008 р.